# ПРЫКЛАДНЫЯ ЗАДАННІ
## для варыятыўнай часткі кваліфікацыйнага экзамену ў працэсе атэстацыі на прысванне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
## Накірунак дзейнасці: настаўнікі беларуская мовы і літаратуры

*1. Адзначце, што з'яўляецца асновай для фарміравання функцыянальнай, перш за ўсё чытацкай, адукаванасці вучняў:*
а) тэкст (мастацкі, навуковы, афіцыйны);
б) сказ;
в) слова.
*2. Адзначце слова (словы), у якім (якіх) назіраецца прыпадабненне папярэдняга зычнага гука да наступнага мяккага (асіміляцыя):*
а) згінуць;
б) світанак;
в) з Гімалай;
г) мадэрнізме;
д) скіснуць.
*3. Устанавіце сэнсавую адпаведнасць паміж падкрэсленымі фразеалагізмамі ў левым і правым слупках. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Напрыклад: А2Б5В3Г4.*

| | |
|---|---|
| А. Усё пакінуць след павінна, бо, як пачаўся ***белы свет,*** прамень, пясчынка і расінка нязменна пакідаюць след. | 1. "Дачушка мая прыгожая – ***свет не бачыў***", – хвалілася Ганна. |
| Б. "А хіба бліжэй не было працы, што ты падаўся на ***край свету***?" – удакладніў былы аднакласнік. | 2. Добра ў вёсцы, прачнуўшыся ***ні свет ні зара***, прабегчыся па роснай траве да рэчкі і плюхнуцца ў прыемную пасля цёплай ночы ваду. |
| В. У кожнага ў жыцці, спадзяюся, былі такія хвіліны, калі крыкнуць ***на ўсю моц*** хочацца ад шчасця. | 3. "Не трэба мне ваш санаторый, не пацягнуся я ***за блізкі свет***", – аднекваўся дзядуля. |
| Г. Віктар ***чуць свет*** забег да сябра, каб падзяліцца з ім уражаннямі ад працы на новабудоўлі. | 4. Званы Хатыні хоць ціха звоняць, але гучаць ***на ўвесь свет***. |
| | 5. Каторы год гляджу на ***божы свет***, а ўсё ніяк не нагляджуся. |

*4. Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі парамі слоў і іх сэнсавай характарыстыкай. Адзначце варыянт правільнага адказу. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Напрыклад: А2Б5В3Г4.*

| | |
|---|---|
| А. Не зрабіў ***шкоды*** – не прынёс ***карысці***. | 1. Амонімы |
| Б. Заліць ***фундамент*** – закласці ***падмурак***. | 2. Мнагазначнае слова |
| В. ***Падобны*** выпадак – ***падобны*** з твару. | 3. Паронімы |
| Г. Узяць ноту ***соль*** – калійная ***соль.*** | 4. Сінонімы |
| | 5. Антонімы |

а) А5Б4В1Г2;
б) А3Б2В1Г4;
в) А2Б3В1Г5;
г) А5Б4В2Г1;
д) А3Б4В1Г2.

*5. Адзначце прыклады, у якіх прыметнік правільна дапасаваны да назоўніка:*
1) два рукапісных артыкулы;
2) беларуская жывапіс;
3) кваліфікаваная адвакат Алеся;
4) густы накіп;
5) разнастайнае меню.
*6. Адзначце рад слоў (словазлучэнняў), у якім усе словы напісаны правільна:*
а) алітэрацыя, Токіо, дзве дзявятыя;
б) фаўна, васямнаццаты, камп’ютар;
в) есаул, маянэз, Люблінская унія;
г) восемдзясят, Другая сусветная вайна, катар.
*7. Адзначце слова, у напісанні якога дапушчана памылка:*
а) макракосмас;
б) светла-ружовы;
в) асабліва важны;
г) усходне-славянскі;
д) віцэ-прэм’ер.
*8. Адзначце прыклады, у якіх* ***не*** *з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна:*
1) тратуары **(не)** падмецены;
2) **(не)** аглядныя прасторы;
3) **(не)** адпраўлены сябру ліст;
4) **(не)** выпадкова ўбачыць;
5) **(не)** пазнаўшы аднакласніка.
*9. Адзначце сказы, у якіх правільна ўжыта часціца* ***ні:***
1) **Ні** хто іншы, як лістапад, пашыў прыродзе світку залатую.
2) Сяброўства **ні** плануюць.
3) Як цябе **ні** любіць, мой чароўны азёрны край!
4) Колькі б **ні** мінула часу ад зараджэння кніжнай справы, а нас не перастае хваляваць тая далёкая кніга, з якой усё і пачалося.
5) **Ні** разу не чуў я фальшывых нот у драздоў.
*10. Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Напрыклад: А2Б5В3Г4.*

| | |
|---|---|
| А. Прырэчны | 1. Бяссуфіксны |
| Б. БДУ | 2. Прыставачны |
| В. Паабапал | 3. Прыставачна-суфіксальны |
| Г. Падтрымка | 4. Суфіксальны |
| | 5. Абрэвіяцыя |

*11. Вызначце сінтаксічную функцыю інфінітыва ў наступным сказе:*
Развітваючыся, Вера Паўлаўна прапанавала ***сустрэцца*** ў наступным годзе.
1) дзейнік;
2) выказнік;
3) дапаўненне;
4) азначэнне;
5) акалічнасць.
*12. Адзначце схему, якая адпавядае прыведзенаму сказу (улічыце, што знакі прыпынку паміж часткамі сказа не пастаўлены):*
У ранішнім лесе не дзеля забавы з бярозкі на бярозку куляй перашмыгвалі чорныя, быццам у сажы, шпакі і заўзята барабанілі па дрэвах сваімі вострымі дзюбамі даўгахвостыя дзятлы павінны птушкі клапаціцца пра сняданак для сябе і для сваіх птушанят.
а) [ ] і [ ]: [ ].

б) [ ], і [ ]: [ ].
в) [ ], і [ ] – [ ].
г) [ ] – і [ ]: [ ].
д) [ ], і [ ], [ ].

*13. Адзначце правільны варыянт пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказе:*

У студзені і лютым пёк мароз ды гуляла-шалела мяцеліца а вось цяпер усё паласкавела завірухі зніклі мароз паслабеў неба пачало блакітнець а пасмялелае сонца дзёрзка памкнулася ўгару.

а) коска, двукроп'е, коска, коска, коска;
б) коска, коска, двукроп'е, коска, коска, коска;
в) коска, коска, коска, коска, коска, коска;
г) коска, працяжнік, коска, коска, коска;
д) коска, коска, працяжнік, коска, коска, коска.

*14. Знайдзіце словазлучэнне, якое ў беларускай мове адрозніваецца склонавай формай залежнага слова. Запішыце словазлучэнне па-беларуску:*

а) видеть насквозь;
б) видеть в темноте;
в) видеть своими глазами;
г) видеть результаты.

*15. Вызначце тып тэксту. Адказ запішыце:*

Люблю дарогі. У дарогу я магу ехаць у любы час, у любое надвор'е і ніколі не скажу, што стаміўся. Дарога не то малодзіць мяне, не то абнаўляе, не то поўніць нечым вельмі патрэбным, жывым, энергічным. Дарогамі апавіты ўвесь наш край, і, колькі б ні ездзіў, з кожным разам будзеш усё больш і больш любіць іх. Там сустрэнуцца людзі, пазнаўшы якіх, ты сам станеш лепшы, чысцейшы. Там народзяцца думы, з якімі хораша і памаўчаць, і памарыць.

*16. Для літаратуры якога перыяду было характэрна з'яўленне палемічнай публіцыстыкі (адкрытых спрэчак, публічнай перапіскі паміж прадстаўнікамі розных канфесій і грамадскіх структур у выглядзе лістоў, пасланняў, водпаведзяў, памфлетаў, чалабітных скаргаў, прадмоў, пасляслоўяў):*

а) літаратура эпохі Адраджэння;
б) літаратура эпохі Сярэднявечча;
в) літаратура эпохі Асветніцтва;
г) антычная літаратура.

*17. Вызначце мастацкі напрамак у літаратуры па наступным азначэнні:*

“Мастацкі напрамак, які ўзнік у канцы XVIII стагоддзя ў Заходняй Еўропе, а затым пашырыўся ў літаратуры сусветнай. Гэты напрамак стварыў тып героя-бунтара, выключнай асобы, супрацьпаставіў рэальнаму ідэальнае, завастрыў увагу на выключных характарах, абставінах і пачуццях”.

а) класіцызм;
б) рамантызм;
в) сентыменталізм;
г) рэалізм.

*18. Як называецца стылістычная фігура, ужытая ў вершы М. Багдановіча:*

Ты не будзеш, крынічанька,
Ад разводдзя свайго ў вясну паўней;
І палюбіш, дзяўчынанька,
Ды не так, як любіла даўней!

а) эпіфара;
б) анафара;
в) паралелізм.

*19. Каму з паэтаў належаць наступныя радкі, якія сталі афарызмам?*
Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,
Зямля дасць волі, дасць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,
Зямля дзяцей тваіх не кіне,
Зямля – аснова ўсёй айчыне.

1) Янка Купала;
2) Якуб Колас;
3) Максім Багдановіч;
4) Уладзімір Караткевіч;
5) Францішак Багушэвіч;
6) Максім Танк.

*20. Устанавіце адпаведнасць паміж імёнамі беларускіх пісьменнікаў і назвамі мясцін. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Напрыклад: А2Б5В3Г4.*

а) Янка Купала;
б) Якуб Колас;
в) Максім Багдановіч;
г) Аркадзь Куляшоў;
д) Пятрусь Броўка;

1) леснічоўка Альбуць;
2) фальварак Свіраны;
3) горад Ніжні Ноўгарад;
4) вёска Пуцілкавічы;
5) вёска Саматэвічы;
6) вёска Вязынка.

*21. Суаднясіце твор пісьменніка і літаратурнага героя. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Напрыклад: А2Б5В3Г4.*

а) Францішак Багушэвіч “Кепска будзе”;
б) Янка Купала “Раскіданае гняздо”;
в) Якуб Колас “На ростанях”;
г) Іван Шамякін “Сэрца на далоні”;
д) Андрэй Макаёнак “Зацюканы апостал”.

1) Малыш;
2) Антон Яраш;
3) Андрэй Лабановіч;
4) Сымон Зяблік;
5) Аліндарка.

*22. Работа над пераказам звязана з фарміраваннем як агульных, так і спецыфічных камунікатыўных уменняў. Адзначце, для выканання якога віду пераказу неабходны наступныя ўменні: раскрываць тэму і асноўную думку тэксту пэўнага стылю; паслядоўна выкладаць падзеі, не парушаючы часавых, прасторавых, прычынна-выніковых сувязей; перадаваць логіку і кампазіцыю тэксту-арыгінала:*

а) сціслы пераказ;

б) выбарачны пераказ;

в) падрабязны пераказ.